ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO.43 (3403) ● ● ЧАЦВЕР, 13 ЛІСТАПАДА, 2014

ШТОТЫДНЁВІК "ГОЛАС РАДЗІМЫ" МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**Сустракалі з караваем**

Беларусы з Барнаула прыехалі да суайчыннікаў у Тальцы з канцэртнай праграмай, а паехалі дадому з моцным зарадам бадзёрасці і аптымізму Стар. 2



**Каласавіны — на славу Айчыны**

У пару нараджэння Якуба Коласа ў Беларусі годна ўшанавалі яго памяць Стар. 3



**Дабрацца да нябёс**

У Мінску ладзілася вечарына да 90-х угодкаў пісьменніка Артура Вольскага Стар. 4

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

# Сябруем школамі, ліцэямі, гімназіямі

## Цёплыя сустрэчы адбываюцца дзякуючы суайчыннікам-беларусам з Прыбалтыкі ды Эстонскаму таварыству Мінска "Ластаўка"



Пад гукі гітары ў Табасалускай гімназіі хораша спявалі па-беларуску мінскія школьнікі і ліцэісты

Як вядома, суайчыннікі ў замежжы могуць быць адметнай стваральнаю сілай, якая збліжае народы. Тое можна бачыць на прыкладзе эстонцаў у Беларусі і беларусаў у Эстоніі. Я раскажу пра апошнюю падзею: з 26 па 28 кастрычніка па запрашэнні некамерцыйнай арганізацыі "Цэнтр вучобы і развіцця EVA-Studiorum" у Эстоніі гасцявала дэлегацыя Эстонскага таварыства Мінска "Pääsuke"/"Ластаўка". Віталі мы і сваіх суайчыннікаў, бо ў складзе дэлегацыі былі групы з мінскіх ліцэя №1 (ліцэісты са старэйшых класаў і выкладчыкі) і з 50-й сярэдняй школы.

Дарэчы, актывісты з таварыства "Ластаўка" не ўпершыню прывозяць у Эстонію дэлегацыю мінскіх ліцэістаў і школьнікаў. Гэта — добрая магчымасць для іх, каб на свае вочы пабачыць, як жывуць эстонцы, далучыцца да іх культурных традыцый. Увогуле ж мэту падобных паездак Анастасія Лісоўская, дырэктар турагенцтва "Эсталайн", якое створана пры Эстонскім таварыстве Мінска, вызначае так: гэта не проста экскурсійныя, а навучальныя, пазнавальныя туры. Яны, лічыць Анастасія, развіваюць тых, хто ў іх удзельнічае, і скіраваныя на пашырэнне стасункаў паміж Эстоніяй і Беларуссю. Эстонская абшчына мэтанакіравана працуе як са школьнымі групамі, так і з выкладчыкамі школ і ўніверсітэтаў, якім цікава пазнаваць не толькі гісторыю прыбалтыйскай краіны, пабачыць славутасці. У эксклюзіўных паездках мінчанам глыбей можна пазнаёміцца з культурным, адукацыйным, сацыяльным жыццём Эстоніі.

Пагадзіцеся: такі досвед працы эстонскай этнасуполкі варты пераймання. Хочацца, каб ім пацікавіліся і беларускія суполкі ў розных краінах замежжа. Бо знойдзецца, мяркую, шмат жадаючых паглядзець на Беларусь і беларусаў скрозь прызму сваіх прафесійных інтарэсаў. Асабліва цікава, як мне падаецца, ладзіць такія кантакты на ўроўні школ, ліцэяў, іншых адукацыйных устаноў.

Гэтам разам у праграме было наведванне Таліна, Стакгольма, Рыгі ды Вільнюса. Асобны пункт — знаёмства з Табасалускай гімназіяй, у якой я, беларуска па родавых каранях, працую настаўніцай рускай мовы. Я ж выступіла і арганізатарам сустрэчы, бо ўваходжу ў праўленне Цэнтра вучобы і развіцця EVA-Studiorum. У нас былі цёплыя зносіны, цікавы прыём. Тэму для абмеркавання выбралі такую: прафарыентацыя і кар'ера. Госці з Мінска хацелі больш даведацца, як вучняў у старэйшых класах у Эстоніі рыхтуюць да будучых прафесій, якія тут умовы паступлення ў ВНУ. Вучні 12 класа Анетэ Лаас, Свен Сабер і Артур Аўчыннікаў правялі экскурсію па гімназіі, адказалі на пытанні гасцей. Перад пачаткам канцэрта, які рыхтавалі абодва бакі, з прывітаннем выступіла дырэктар гімназіі Каралін Кадая. Канцэрт з эстонскага боку рыхтавалі настаўнікі Отс Елін, Кальм Кайры, Вясене Астрыд з іх вучнямі-гімназістамі. Выдатным было і выступленне мінскіх падлеткаў: яны хораша праспявалі песні на беларускай мове, прывезлі і салодкі пачастунак з Беларусі. А з сабою нашы госці павезлі эстонскія сувеніры, уражанні ад ветлівага прыёму і сардэчную цеплыню землякоў-беларусаў.

Думаю, такія міжнародныя сустрэчы — гэта як закладка прыгожага сада, які надалей не адзін год пры добрым доглядзе зможа даваць каштоўныя плады сяброўства, паспрыяе добрым стасункам цэлых пакаленняў з розных краін.

І яшчэ навіна. З 7 па 13 лістапада ў плыні праекта "Школы-пабрацімы" дэлегацыя Табасалускай гімназіі і Цэнтра вучобы і развіцця EVA-Studiorum наведвае Мінск, у тым ліку і 48-ю школу, з якой мы дружым. Так што беларуска-эстонскае сяброўства развіваецца, пашыраецца, мацнее.

**Ніна Пээрна,**
член праўлення Цэнтра вучобы і развіцця EVA-Studiorum, Эстонія

ТАЯМНІЦЫ БЫЦЦЯ

# Навука шчасця ад Георгія Лахоўскага

## Сусветна вядомы вучоны і вынаходнік, які нарадзіўся непадалёк ад Мінска, лічыў: каб пражыць доўга, трэба верыць у неўміручасць

**Любоў Уладыкоўская, Валеры Шалатонін**

### Месца нараджэння: Вілейка ці Ілля

Наша Бацькаўшчына ва ўсе часы шчодра дзялілася талентамі і з суседнімі, і з больш далёкімі краінамі. І там яны раскрываліся. Вось мы і хочам вярнуць менавіта Беларусі яшчэ адно такое імя. Бо, наколькі нам вядома, ні ў навуковай літаратуры, ні ў беларускіх мас-медыя не ўзгадваецца, што Георгій Лахоўскі (1870—1942) — наш суайчыннік. А замежныя спецыялісты добра ведаюць, як шмат зрабіў ён, шукаючы сродкі, каб вылечваць анкалагічныя ды іншыя захворванні. У замежных энцыклапедыях, іншых крыніцах гаворыцца пра Георгія Лахоўскага як "рускага" сусветна вядомага вучонага, вынаходніка, механіка, радыёінжынера, лекара, філосафа. І тыя ж крыніцы сцвярджаюць: ён нарадзіўся недалёка ад Мінска!

Уклад яго ў навуку, медыцынскую практыку цяжка пераацаніць. А шматчастотныя генератары, распрацаваныя нашым суайчыннікам, і цяпер вырабляюцца ў Галандыі, Швейцарыі, выкарыстоўваюцца ў навуковых лабараторыях і медустановах многіх краін. І кнігі вучонага нават цяпер карыстаюцца папулярнасцю ў колах замежных спецыялістаў. Так, у 2010-м на англійскай мове перавыдадзена кніга Георгія Лахоўскага "Тайна жыцця". Больш за тое: у 1983-м у Парыжы адзін вучоны абараніў дысертацыя па медыцыне, прысвечаную навуковай дзейнасці нашага земляка. Таму мы ўпэўнены: выхад кніг вучонага-вынаходніка на беларускай мове будзе значным укладам у нашу навуковую, культурную, гістарычную і грамадскую скарбніцу.

Што ўдалося ўстанавіць? Што Георгій Лахоўскі нарадзіўся 17 верасня 1869 года ў Вілейцы (альбо ў мястэчку Ілля, цяпер на Вілейшчыне) Мінскай губерні. Бацька яго быў чалавекам адукаваным, працаваў адвакатам і выкладчыкам усходніх моў. З маленства Георгій выявіў вынаходніцкі талент: у 6 гадоў сканструяваў вадзяны млын. З 12-ці хлопчык вучыцца ў Мінску, а ў 18 гадоў паступае ў Адэскую Школу мастацтваў і рамёстваў: там, на наш погляд, можна пашукаць дадатковыя звесткі пра яго. Як і ў Парыжы, бо ў снежні 1894-га малады чалавек едзе туды, становіцца студэнтам Сарбоны. Вывучаў фізіку і адначасова – анатомію і фізіялогію чалавека на медфакультэце Парыжскага ўніверсітэта.



Георгій Лахоўскі

→ Стар. 3

БЛІЗКІЯ ЛЮДЗІ

# Сустракалі з караваем

## Беларусы з Барнаула прыехалі да суайчыннікаў у Тальяцці з канцэртнай праграмай, а паехалі дадому з моцным зарадам бадзёрасці і аптымізму

Гэтая восень падарыла нам, актывістам Алтайскай краявой грамадскай суполкі “Беларускае зямляцтва на Алтаі”, незабыўныя сустрэчы з блізкімі па духу людзьмі ў Паволжы. Пра тое, як гурт “Вячоркі” з Барнаула ўдзельнічаў у свяце-канцэрце “Дажынкі” ў Тальяцці, напісаў Сяргей Шылкін у артыкуле “Дажынкі ўсім на радасць” (“Голас Радзімы”, № 41, 30 кастрычніка). І здымак наш у тэксце. А такога, з караваем, якім сустракалі нас сябры, чытачы не бачылі. Таму хачу “наўздагон падзеі” расказаць, як мы ездзілі ў Тальяцці. Можа, досвед будзе і для іншых цікавым. Ведаю, многім творчым гуртам з беларускіх суполак замежжа хочацца недзе выехаць, набрацца ўражанняў, свае таленты паказаць…



Актывісты суполкі “Нёман” сустрэлі суайчыннікаў з Барнаула на пероне ў Самары

У тым, што вандроўка адбылася, ёсць і добры збег абставінаў, і немалыя намаганні барнаульцаў і тальяцінцаў. Мяркую, у грамадскай дзейнасці заўсёды важна адчуваць павевы часу — і, як кажуць, лавіць вецер у свае ветразі, каб рухацца ў выбраным кірунку. Магчымасць “гастроляў” з’явілася ў нас дзякуючы Году культуры ў Расіі. У магутнай культурнай плыні ўдалося беларусам Алтая з’арыентавацца — і атрымаць для зямляцтва субсідыю на творчую паездку ў Тальяцці: яе дала Адміністрацыя Алтайскага краю. Запрашэнне ж атрымалі яшчэ ў сакавіку: ад тальяцінскай суполкі “Нёман” і яе кіраўніцы Людмілы Іванаўны Дзёмінай. Вядома ж, рыхтаваліся. Хваляваліся. Пераадолелі больш за 2700 кіламетраў на цягніку. А як нас сустракалі! Актывісты суполкі “Нёман” чакалі гасцей на пероне ў Самары, і сама Людміла Дзёміна вітала ўсіх па добрай традыцыі продкаў: з хлебам-соллю на беларускім ручніку. Ды яшчэ і з беларускім сцягам. Згадваю той момант — так цёпла на душы! Зямны паклон вам, дарагія землякі, дарагая Людміла Іванаўна, за хвіліны шчасця. Былі мы ў Тальяцці ўсяго двое сутак, але як актыўна жылі! Вядома ж, у нас, як і ў вядомай песні, “первым делом — самолеты”: рэпетыцыя, удзел у свяце-канцэрце “Дажынкі”. Дзеля таго ж і ехалі. Наша выступленне цёпла ўспрынялі тальяцінцы. Была экскурсія па горадзе, афіцыйныя сустрэчы і нефармальныя зносіны. Вельмі спадабаўся нам малады і прыгожы горад Тальяцці, радзіма ўсенародна любімых у савецкі час легкавікоў “Жыгулі”.

І яшчэ раз вялікі дзякуй гаспадыні свята, Людміле Дзёмінай. Пацвярджаю: правільна ёй у Беларусі прысвоена званне “Гаспадыня-беларусачка”. Пра тое можна прачытаць у тэксце “Добрая ў Тальяцці гаспадыня ў хаце” (ГР, 18 ліпеня 2013 года). На свяце-канцэрце “Дажынкі” я, карыстаючыся выпадкам, павіншавала зямлячку з прысваеннем ганаровага — і абсалютна заслужанага! — звання, уручыла Людміле прыгожы букет кветак ад імя беларусаў Алтая. А для гледачоў, заўважыла, тое было адкрыццём: там, пэўна, ніхто пра ўшанаванне Дзёмінай і не ведаў. Сама пра свае заслугі нікому не расказвала. Аднак, думаю, тальяцінскім журналістам варта звярнуць увагу на тое, як цэняць кіраўніцу “Нёмана” і ў Беларусі — можа, і артыкул з “Голасу Радзімы” перадрукаваць. Гэта актуальна, бо кандыдатура Людмілы Дзёмінай, наколькі мне вядома, вылучана грамадскасцю Тальяцці на прысваенне ёй звання “Жанчына года”.

А яна ж сёлета і чарговы дыплом атрымала: закончыла завочна — разам з сынам, Сяргеем Шылкіным — Самарскае абласное вучылішча культуры і мастацтва. Колькі ў ёй імпэту, бескарыслівай любові і адданасці Бацькаўшчыне, якая працаздольнасць! Мы дзякуем Людміле Іванаўне за добрую сцэну і перапоўненую гледачамі залу, за сяброўскі прыём. Жадаем новых поспехаў у канцэртна-асветніцкай дзейнасці, пашырэнні беларускай культуры ў Расіі. У “Голасе Радзімы”, заўважыла, рэгулярна ёсць тэксты пра справы тальяцінскіх беларусаў. Дзёміна сапраўды працуе ў прыклад усім, не маючы аніякай базы, у адрозненне ад суполак, напрыклад, у Новасібірску, Томску ды іншых расійскіх гарадах. У Людмілы Іванаўны, бачылі мы, як і ў мяне: усё ва ўласнай кватэры. Гэта проста Штаб-кватэра! І калі ёсць энергія, любоў да Бацькаўшчыны, то нам многае пад сілу. Прыкінула: ці змаглі б мы праводзіць гэтулькі мерапрыемстваў, як Людміла Дзёміна ды Сяргей Шылкін з іх паплечнікамі? Цяжка за імі ўгнацца… Да таго ж апошнім часам жыву ў сельскай мясцовасці, сядзіба клопатаў патрабуе, на працу езджу ў горад. Зразумела, не кінула грамадскую працу, беларускую культуру, і ніколі не кіну. А прыклад вось такіх людзей, як тальяцінскія беларусы, дае нам усім моцны зарад бадзёрасці і аптымізму.

**Сафія Антоненка,**
кіраўніца суполкі “Беларускае зямляцтва на Алтаі”

ВЕСТКІ

## Мінск — горад крынічны

**Сталіца Беларусі, у якой амаль два мільёны жыхароў, можа поўнасцю перайсці на ваду з падземных крыніц да 2020 года**

Як вядома, чысціня вады — важны складнік нашага здароўя. Пра гэта і дбаюць у першую чаргу спецыялісты, вырашаючы розныя тэхнічныя пытанні на шляху да мэты. Аб тым нядаўна гаварыў журналістам начальнік упраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Дзмітрый Янчык. “Дакладную дату, калі Мінск поўнасцю пяройдзе на ваду з падземных крыніц, назваць не магу, — удакладніў ён. — Усё будзе залежаць ад таго, ці ўдасца своечасова правесці запланаваныя работы, ці будзе фінансаванне ў праекта. Увогуле ж праграма поўнага пераходу мінчан на спажыванне вады толькі з падземных крыніц арыентавана на 2030 год. Але мы будзем імкнуцца, каб гэта адбылося як мага хутчэй. Магчыма, да 2020 года ўвесь Мінск пяройдзе на спажыванне вады з артэзіянскіх свідравін”.

Паводле слоў Дзмітрыя Янчыка, спажыванне вады з паверхневых крыніц будзе зніжацца паэтапна. Нядаўна праходзіла нарада па праграме “Чыстая вада” з удзелам шэрагу спецыялістаў, у якой удзельнічалі намеснік Міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі, а таксама першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама. На нарадзе было прынята рашэнне: больш інтэнсіўна выкарыстоўваць магчымасці тых крыніцы водазабеспячэння, што ўжо існуюць, шляхам іх рэканструкцыі. Такім чынам водазабор з іх будзе пастаянна павялічвацца.

Цяпер у Мінску дзейнічаюць 344 свідравіны на 16 падземных водазаборах. Некаторыя з гэтых падземных крыніц будуць паднаўляцца, перасвідроўвацца — каб такім чынам павялічыць іх прадукцыйнасць. І бурэнне новых свідравін таксама будзе праводзіцца. Паводле слоў Дзмітрыя Янчыка, у 2015-2016 гадах у выніку павелічэння прадукцыйнасці свідравін Мінск атрымае дадаткова тысячы кубаметраў вады з падземных крыніц. Цяпер ваду з паверхневых крыніц атрымліваюць жыхары Маскоўскага і Фрунзенскага, часткі Кастрычніцкага раёнаў Мінска.

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

# Мы — разам з МАЗам

**Самадзейныя артысты вакальнага гурта “Крывічы” з Іркуцка дапамагалі ў Новасібірску беларускім вытворцам знаходзіць дарогу да расійскіх спажыўцоў**

Часам за культурнымі праектамі не ўсім суполкам замежжа ўдаецца рухаць іншыя справы. Скажам, наладжваць дзелавое супрацоўніцтва з беларускімі рэгіёнамі. У нас жа нядаўна была магчымасць, можна сказаць, “культурай” рухаць “эканоміку і гандаль”. У кастрычніку мы, беларусы з Іркуцка, былі “на гастролях”. Вялікае мерапрыемства, куды нас запрасілі, мела назву: “Нацыянальная выстава Рэспублікі Беларусь у Новасібірску”. У прэстыжным месцы горада — Экспацэнтры — размясціліся прадстаўніцтвы розных прадпрыемстваў Беларусі. Былі нават землякі з роднага майго горада, якія прадстаўлялі Полацкі малочны завод. А якія ў іх смачныя тваражок ды сыркі, якімі нас частавалі! Карацей, пабачыце на прылаўку — бярыце паболей.

Выстава — падзея знакавая, пра тое сведчылі яе высокія госці. Прыкладам, з Урада Беларусі быў віцэ-прэм’ер Уладзімір Сямашка, былі кіраўнікі Сібірскай Федэральнай акругі. Бачылі мы губернатараў Краснаярскага краю, Кемераўскай і Новасібірскай абласцей. Сустрэліся з Людмілай Берлінай: яна спікер Заканадаўчага сходу Іркуцкай вобласці.

Але што ж рабілі ў такой шаноўнай грамадзе “Крывічы”? Нас спецыяльна запрасіла і адправіла ў Новасібірск акцыянерная таварыства “Сібір-МАЗ-Сэрвіс”, і мы два дні працавалі там на карысць Бацькаўшчыны. Як? Спявалі і танчылі! На гэта раз кінуць усе свае справы змаглі: я, Воля Галанава і Каця Тукач. Спадзяемся, пад такія спевы ўся беларуская прадукцыя ў Сібіры будзе разлятацца, як кажуць, з лёту. Мы ж разумеем: везці артыстаў з Беларусі было б не так рэнтабельна. А мы — амаль побач. Ды і лёгкія на пад’ём. Мяркую, беларуская культура была прадстаўлена на выставе годна. Мы ж вельмі стараліся! Не ведаю, ці выкарыстоўваюць такі крэатыўны рэсурс беларускія арганізатары іншых выстаў. Можам ім нешта падказаць, і свае паслугі прапанаваць. На агульную карысць. На славу Бацькаўшчыны.




Іркуцкія беларусы спяваюць на выставе ў Новасібірску

Журналісты ахвотна рабілі здымкі з нашым удзелам. Яно і зразумела: чалавек у кадры, а тым больш у нацыянальным строі… Беларуская журналістка Аксана Манчук, якой мы вельмі ўдзячныя, даслала электроннай поштай некалькі здымкаў. Іх і дасылаю ў рэдакцыю.

**Алег Рудакоў,**
г. Іркуцк

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

# Каласавіны — на славу Айчыны

## У пару нараджэння Якуба Коласа ў Беларусі годна ўшанавалі яго памяць

Іван Ждановіч



Землякі Песняра вітаюць гасцей Каласавін у вёсцы Мікалаеўшчыне

Адзін з тэкстаў у "Голасе Радзімы" пра восеньскую сустрэчу гасцей-пісьменнікаў, удзельнікаў другога Фэсту мастацтваў беларусаў свету ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа называўся так: "Каласавіны — свята Айчыны". Дырэктар музея Зінаіда Камароўская прапанавала тады суайчыннікам і ў замежных суполках ладзіць Каласавіны, як тое амаль 30 гадоў робіцца ў Беларусі. Спадзяемся, покліч пачуты. А як адзначалі 132-гі дзень нараджэння Песняра? "Як заўсёды — прыгожа, з навуковай канферэнцыяй, ускладаннем кветак да помніка Якубу Коласу на аднайменнай мінскай плошчы, — расказала Зінаіда Мікалаеўна. — Адметнасцю ўрачыстасцяў стала адкрыццё "Паэтычнага кутка Якуба Коласа" на сядзібе пры музеі".

На сайце Коласаўскага музея загадзя была размешчана абвестка-запрашэнне на Каласавіны-2014. Спачатку музейшчыкі ладзілі свята для выхаванцаў дзіцячых садкоў. А 3 лістапада літаратурна-асветніцкае свята Каласавіны прадоўжылася: праходзіла 29-я па ліку міжнародная навуковая канферэнцыя "Якуб Колас. Урокі гісторыі". Яна прысвячалася сёлета 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 100-годдзю з часу пачатку Першай сусветнай вайны (удзельнічаў у ёй і Якуб Колас) і 55-годдзю адкрыцця Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа: апошнюю дату адзначаць 4 снежня. "Удзельнічалі навукоўцы з Расіі і Беларусі — усяго каля 50 чалавек, — удакладніла Зінаіда Камароўская. — Працавала 4 секцыі, было шмат цікавых дакладаў. Радуе, што адкрываюцца невядомыя факты з біяграфіі Песняра, даследуюцца яго творы, выходзяць новыя кнігі".

Пад час Каласавінаў пры будынку мінскага музея адкрыты "Паэтычны куток Якуба Коласа", у якім устаноўлены драўляныя скульптуры герояў трылогіі "На ростанях": настаўніка Лабановіча і ягонай дзяўчыны Ядвісі. Трэцяя скульптура — Сымон-музыка. Іх зрабіў вядомы майстар-разьбяр Сяргей Кляшчук. Ён даўно працуе на коласаўскую тэму: яшчэ у 1990-92 гадах стварыў 5 скульптур у Стаўбцоўскім раёне, для мемарыяльнага комплексу "Шлях Коласа". Цяпер у дырэктаркі музея ўзнікла новая ідэя: працягнуць той шлях і ў Мінск, туды, дзе жыў Пясняр апошнія гады. На сядзібе для малых наведвальнікаў музея ўстаноўлены драўляныя выявы Шчупака і Сома — герояў коласаўскага твора "Рак-вусач". Ужо ў рабоце і выявы герояў твора "Савось-распуснік": Савось, Каток і сабачка Рудзька. "Музей наведвае шмат экскурсій, шмат дзяцей — ім будзе цікава разглядваць герояў коласавых твораў, — лічыць З. Камароўская. — Ля кожнай скульптуры ўстаноўлены спецыяльныя модулі з радкамі-словамі Песняра".

У наступным годзе ўваход у "Паэтычны куток Якуба Коласа" ўпрыгожыць разная брама, паставяць там і альтанку: каб праводзіць сустрэчы, гульні, заняткі з дзецьмі на свежым паветры.

ТАЯМНІЦЫ БЫЦЦЯ

# Навука шчасця ад Георгія Лахоўскага

(Заканчэнне. Пач. на стар. 1)

### Энергіі добрыя і ліхія

У 1905-м Георгій узяў шлюб з парыжанкай, у іх было трое дзяцей: П'ер (1907), Мары (1909), Серж (1913). Праз два гады Лахоўскі атрымаў французкае грамадзянства. Пра тое, наколькі напружанай была ягоная даследчыцкая праца, сведчаць кнігі суайчынніка. Першая выйшла ў 1925-м у Парыжы: "Паходжанне жыцця, выпраменьванне жывых істот". Спонсар выдання і аўтар прадмовы — вядомы фізіятэрапеўт Арсен Дарсанваль. У 1929-м выходзіць найбольш вядомая кніга Георгія Лахоўскага "Тайна жыцця", перакладзеная пазней з французкай на іншыя мовы.

Вучоны-вынаходнік выкладае арыгінальныя падыходы да фундаментальных праблем жыцця. Ён лічыць, і пазней пацвярджае тое эксперыментальна, што ўсе жывыя клеткі валодаюць вагальнай структурай з пэўнай рэзанананснай частатой. Такім чынам, кожная клетка — і крыніца, і адначасова прыёмнік выпраменьванняў. Знешнія нябачныя "добрыя" энергіі, што гарманізуюць клеткі і арганізмы, — гэта, на думку аўтара, выпраменьванні зямныя, атмасферныя і касмічныя. Жывучы ў электрамагнітным полі, якое мае шырокі спектр частот, кожная клетка асімілюе знешнюю энергію той частаты, якая ёй патрэбная, пры тым таксічнае, "ліхое" выпраменьванне бактэрый ці вірусаў падаўляецца. Гэтая ды іншыя ідэі сталі асновай для стварэння вучоным новага метаду і спецыяльнага генератара (Multiple Wave Oscillator, 1931г.), прызначанага для лячэння ў тым ліку і анкахвароб.

Па ўсёй бачнасці, вучоны здолеў выкарыстаць прыхаваны досвед розных народаў. Як вядома, амулеты і бранзалеты, жаночыя каралі раней надзяляліся звышнатуральнымі сіламі. Яны ж, выробленыя ў адпаведнасці з ідэямі Лахоўскага — звычайна медныя і абавязкова незамкнёнага контуру — умацоўваюць імунную сістэму, паляпшаюць сон, павялічваюць здольнасць да канцэнтрацыі ўвагі і энергію чалавека. І нават, сведчаць доследы нашых дзён, абараняюць ад шкоднага ўздзеяння мабільных тэлефонаў.

### Трэба верыць у неўміручасць

Што з ідэй земляка для нас асабліва істотнае? Лахоўскі быў перакананы: каб захаваць здароўе, трэба прытрымлівацца пэўных правілаў. Першае: верыць у магчымасць дажыць да глыбокай старасці. Другое: пазбягаць гневу, злосці, зайздрасці, рэўнасці, раздражнення і, наадварот, развіваць у сабе добрыя пачуцці і добры настрой, што неабходна для падтрымання як маральнай, так і фізічнай раўнавагі. Трэцяе: не варта баяцца смерці, трэба верыць у неўміручасць. Страх смерці скарачае жыццё. Пры невыкананні гэтых умоў і з іншых прычын — нездаровае харчаванне, атручванне, стрэсы, прысутнасць вялікай колькасці бактэрый ці вірусаў… — клеткі пачынаюць хварэць: пэўныя клетачныя структуры блакуюцца, гэта значыць перастаюць успрымаць знешнюю "добрую", лячэбную энергію на прыдатнай частаце.

Георгій Лахоўскі, вядома ж, хацеў пацвердзіць свае высновы на практыцы. Ён атрымаў дазвол ад кіраўніцтва некалькіх парыжскіх бальніц, каб удзельнічаць у лячэнні анкахворых — і дабіўся значных поспехаў. Стан хворых паляпшаецца, некаторыя цалкам выздараўліваюць. На пытанне аднаго з сяброў, чаму не бярэ платы за лячэнне, Лахоўскі адказвае: "Усё жыццё і ўсе свае грошы я аддаў на тое, каб змагацца з ракам... Няма нічога лепшага, як бачыць сваіх колішніх пацыентаў здаровымі і моцнымі, чытаць у іх вачах глыбокую ўдзячнасць. Гэта для мяне больш каштоўнае, чым усе багацці і шанаванні гэтага свету".

### Жыццё і смерць на вагах Вечнасці

Свае погляды на прычыны і метады лячэння анкалогіі Лахоўскі раскрывае ў кнігах "Уклад у этыялогію раку" (1927) і "Утварэнне пухлін і парушэнне раўнавагі клетачных выпраменьванняў" (1932). На пачатку 30-х выходзяць кнігі "Навука шчасця", "Вечнасць, жыццё і смерць", "Зямля і мы", "Матэрыя". Даследаванні вучонага прэзентуюцца ў Парыжскай Акадэміі Навук, Лонданскім Каралеўскім Таварыстве, Хімічным Таварыстве Берліна, у Акадэміі Навук Партугаліі… А тым часам "энергіі ліха", кажучы ў плыні поглядаў даследчыка, усё больш згушчаюцца ў свеце: набліжаецца Другая сусветная вайна. Францыю займаюць фашысты, і антырасісцкія погляды Георгія Лахоўскага, выкладзеныя ў кнігах "Расізм", "Цывілізацыя і расісцкае вар'яцтва", увайшлі ў вялікую супярэчнасць з ідэалогіяй новай улады. У 1941-м Лахоўскі вымушаны быў эміграваць у ЗША, у Брукліне яго сустракае і дапамагае ўладкавацца на працу доктар Дызраэлі Кобак. Некалькі шпіталяў Нью-Ёрка згадзіліся пратэсціраваць апарат, створаны вучоным, і вынікі выкарыстання яго ўражваюць. Але, магчыма, супрацьстаяць той нябачнай пагрозе, што навісла над ім, нішто ўжо не магло. Усе планы і само развіццё новага метаду лячэння ў Амерыцы абрываюцца трагічнай смерцю вучонага: у Нью-Ёрку яго збівае лімузін, і 31 жніўня 1942 года ў шпіталі Адэльфі ў Брукліне вучоны развітваецца з гэтым светам. Яму было 73 гады, ён пакідае жонку і бліжэйшага саратніка — сына Сержа, які і працягнуў працу разам з доктарам Кобакам.



Шматчастотны генератар Георгія Лахоўскага зручны ў карыстанні

### Генератары здароўя

У студзені 45-га у Нью-Ёрку быў заснаваны Інстытут шматчастотных хваляў імя Георгія Лахоўскага, старшынёй яго становіцца Дызраэлі Кобак, сакратаром — сын вучонага Серж Лахоўскі (1913—2003). Дзякуючы іх намаганням сотні генератараў шматчастотных хваляў выкарыстоўваюцца лекарамі, ветэрынарамі, хірургамі практычна па ўсім свеце. У 2011-м яшчэ раз эксперыментальна пацверджаны многія высновы Георгія Лахоўскага пра здольнасць электрамагнітных палёў пэўных частот стабілізаваць і змяншаць ракавыя пухліны. Гэта зрабіла, у прыватнасці, даследчая група пад кіраўніцтвам Барыса Пашэ з універсітэта Алабамы ў ЗША, які піша, што "гэта адкрывае новыя шляхі да кантролю росту пухліны і можа мець шырокае ўжыванне для лячэння раку".

Да ідэй Г. Лахоўскага з увагай ставяцца і ў Беларусі. Варта па драбніцах сабраць усё, што магчыма, пра жыццё і дзейнасць земляка. Спадзяемся, да працы падключацца і суайчыннікі з розных краін. З часам, упэўнены, прыйдуць да беларускага чытача цікавыя кнігі вучонага і вынаходніка, а яго імя, памяць будуць належным чынам ушанаваныя.

АСОБЫ

# Дабрацца да нябёс

## У Мінску ладзілася вечарына да 90-х угодкаў пісьменніка Артура Вольскага

**Сяргей Шаўцоў**



Удзельнікі вечарыны ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча

Вечарына пад адметнай назвай "Дабяруся да нябёс" (так называлася адна з кніжак юбіляра, што выйшла ў 1984 годзе), прысвячалася 90-м угодкам Артура Вольскага — выдатнага майстра слова, паэта, празаіка, драматурга і перакладчыка. Добрым словам згадвалі творцу, гаварылі: ягохапала на ўсё. Пісаў вершы для дарослых і дзяцей, аповесці і апавяданні, п'есы для юнацтва і аперэтачныя лібрэта, мастацкія і дакументальныя кінасцэнары. Нават інтэрмедыі для эстрады і цырка. І літаратурныя і публіцыстычныя артыкулы. Гэта Артур Вольскі быў адным з заснавальнікаў часопіса для дзяцей "Вясёлка" — і заканамерна, што вядомы пісьменнік, цяперашні галоўны рэдактар выдання Уладзімір Ліпскі ўдзельнічаў у вечарыне. Артур Вольскі напісаў лібрэта першай беларускай аперэты для дзяцей, склаў падручнік беларускай мовы "Беларусачка". Перакладаў мастацкія творы з рускай, украінскай, літоўскай, латышскай, нямецкай ды іўрыта. Сем зборнікаў паэзіі, больш за 40 кніг прозы Артура Вольскага і цяпер запатрабаваныя ў бібліятэках і прыватных кнігазборах.

Варта нагадаць, што Артур Вітальевіч — адзін з прадстаўнікоў таленавітага роду Вольскіх. Нарадзіўся 23 верасня 1924 года ў Койданаве (цяпер Дзяржынск) пад Мінскам у інтэлігентнай сям'і: маці — артыстка, бацька — пагранічнік. Віталь Вольскі, дарэчы, з часам стаў вядомым драматургам, празаікам, вучоным, аўтарам праслаўленай п'есы "Несцерка".

Вучыўся Артур Вольскі ў 25-й мінскай Узорнай чыгуначнай імя Аляксандра Чарвякова беларускай школе, дзе выкладаў геаграфію сам Іван Фёдараў (пісьменнік Янка Маўр). Пасля сямі класаў паступіў у Віцебскае мастацкае вучылішча, на пачатку вайны эвакуяваўся ва Уральск: працаваў там мастаком у тэатры. У 1942 годзе яго прызвалі ў войска, трапіў на флот. Служыў на Далёкім Усходзе: боцманам, мінёрам, ваенным журналістам. З 1952-га працаваў у рэдакцыі газеты "Чырвоная змена", часопісах "Бярозка" і "Вясёлка". Пазней 15 гадоў узначальваў Беларускі тэатр юнага гледача, сябрам якога быў з часу яго адкрыцця. Меў шэраг дзяржаўных узнагарод.



Артур Вольскі

У творах Артура Вольскага шмат дабрыні і радасці, яны і сёння цікавыя для моладзі, людзей старэйшага пакалення. На вечарыне было шмат вучняў 25-й мінскай гімназіі — пераемніцы школы, у якой вучыўся будучы пісьменнік.

Успамінамі пра Артура Вольскага дзяліліся яго родныя і сябры. Заслужаная артыстка Беларусі Ларыса Горцава, удава пісьменніка, чытала яго вершы. Паэт Мікола Чарняўскі расказваў пра старэйшага калегу як Чалавека з вялікай літары. Акцёры ТЮГа Мікола Лявончык, Леанід Улашчанка згадвалі пра свае зносіны з ім як дырэктарам тэатра, а паэтка Раіса Баравікова ўспаміналі Артура Вольскага як грамадскага дзеяча, які змагаўся за мову, культуру і незалежнасць Беларусі. Выступаў на вечарыне сын пісьменніка, вядомы музыкант Лявон Вольскі. Настаўніца 25-й гімназіі, паэтка Вольга Шпакевіч расказала, як у гэтай навучальнай установе шануюць памяць пра яе знакамітага вучня.

РОДНАЕ

# Восеньскія Дзяды

**Рыгор Арэшка**

**На пачатку лістапада, у трэцюю суботу па Пакровах беларусы ўшаноўваюць сваіх продкаў**

"Дзяды" — гэта не толькі паэма Адама Міцкевіча. Твор грунтуецца на язычніцкім абрадзе памінання продкаў у беларусаў. Той абрад вялікі паэт, што нарадзіўся на Навагрудчыне, добра ведаў, і продкаў шанаваў. Яны ж, паводле традыцыі, закончыўшы зямны шлях, становяцца багамі ды з Неба-Выраю дапамагаюць нам, калі жывем з імі ў ладзе, ці не спрыяюць таму, хто адбіўся ад рук.

Пра тое гаварылі і на "Перадддзядоўскай сустрэчы" ў мінскім Літаратурным музеі Петруся Броўкі. Фалькларысты сцвярджаюць, што абрад мае важнае значэнне ў светапоглядзе суродзічаў. Лічыцца, што продкі пад час Вялікіх восеньскіх Дзядоў нібы падлічваюць разам з намі: чаго дасягнулі, чым можам ганарыцца, што нашчадкам пакінем у спадчыну. Трымаць "справаздачу" варта ў згодзе з традыцыяй: інакш Дзяды нас могуць і не зразумець.

Беларусы ладзілі памінальныя вячэры 1 лістапада. Дзяды спрадвек адзначаюць у трэцюю суботу пасля Пакроваў — у праваслаўных тое свята штогод 14 кастрычніка. А 2 лістапада ў каталіцкім календары быў Дзень Задушны: калі малітва за душы. Памятаючы продкаў, мы дбаем пра будучыню, абрадавымі дзеямі ўмацоўваецца і род, і народ.

СУСЕДЗІ

# Жывыя мелодыі сустрэч

**Мікалай Бойка**

**Жаночы гурт "Рідна пісня" прывёз з Кіева ў Мінск прыгожыя ўзоры ўкраінскай народнай творчасці**

Яшчэ Мікалай Гоголь гаварыў, што народная песня для Украіны — усё: і паэзія, і гісторыя, і бацькоўская магіла… Карацей — цэлы сусвет, асабліва калі дораць песню гледачам такія таленавітыя спявачкі, якія нядаўна былі ў Мінску. Песеннае свята ладзілася на пачатку лістапада ў актавай зале Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур. На сцэне быў народны гурт "Рідна пісня", якім кіруе музыка, спявак, даследчык, вучоны, заслужаны дзеяч культуры Украіны Васіль Трыліс. У гурце сем жанчын, у Мінск прыехалі тры з іх, ды і Уладзімір Самайда, паэт-песеннік, і сам Васіль Герасімавіч выходзіў на сцэну. У такім складзе і ўдзельнічалі ў фэсце "Сіла славянскіх сэрцаў", які праходзіў у Палацы культуры Мінскага трактарнага завода. Акрамя гаспадароў-беларусаў, былі на фэсце гурты з Расіі, Украіны, Польшчы і Літвы.

Пяты ўжо раз "Рідна пісня" прыязджае на беларускія фэсты, і трэці раз — традыцыя! — выступае перад суайчыннікамі. Пагадзіцеся: прыклад варты пераймання. Гурту 17 гадоў, ён шмат выступае на розных фэстах і конкурсах. А якія песні! Некаторыя з іх, дарэчы, ёсць і ў інтэрнэце. Прыхільнікаў — сотні па розных краінах, у тым ліку і ў Беларусі. Я і сам быў у захапленні. Меладычнасць, чароўная мяккасць, глыбіня пачуццяў і нейкая асаблівая сардэчнасць — усё ў тых песнях. Гледачоў сабралася — цэлая зала, гасцей вельмі цёпла сустракалі, не шкадавалі ім апладысментаў. Дарэчы, у рэпертуары гурта ёсць вясельныя, казацкія, рэкруцкія, гістарычныя песні. Хоць вядучая, салістка гурта Аксана Гардзіец і нагадала гледачам, што ўкраінскія народныя песні вельмі цесна звязаны з эмацыйным перажываннем, ды яны і без слоў тое разумелі: некаторыя так і сядзелі з вільготнымі вачыма… І маё сэрца, здавалася, аж спынялася, калі гучалі такія актуальныя сёння для Украіны песні пра расстанне, тугу па любімых, родных, блізкіх. Былі і пра каханне, родную старонку, цеплыню матчыных рук.

У вечарыне ўдзельнічаў Уладзімір Самайда, саліст хору "Чумакі". Разам з Васілём Трылісам яны падарылі гледачам добры настрой, выканаўшы ўкраінскія рамансы, казачыя і лірычныя песні.

На творчы вечар прыйшлі і беларусы, якія любяць Украіну і яе культуру. Як вядома, усім сэрцам любіў Украіну і Янка Купала, пісаў: "Украіна, цвеце любы, сонцам гадаваны...". Максім Рыльскі адзначаў: без перабольшання можна сказаць, што яна была Песняру другой радзімай. У творчым лёсе Янкі Купалы вялікую ролю адыграў Тарас Шаўчэнка: ад яго шмат браў Пясняр, пад яго ўплывам рос як паэт. З назвай зборніка "Кабзар" Шаўчэнкі пераклікаецца паэма Янкі Купалы "Гусляр". У 1909-м Купала прысвяціў Кабзару два вершы, аб'яднаўшы назвай "Памяці Т. Шаўчэнкі". Заклікі да свабоды, дружбы людзей і народаў, зацвярджэнне прынцыпаў гуманізму — усё гэта родніць Купалу з Шаўчэнкам. І Максім Багдановіч бачыў у асобе Тараса Шаўчэнкі вялікага паэта з усясветным імем, даследаваў яго паэтычнае майстэрства. А як любіў Украіну Уладзімір Караткевіч! Ён, як вядома, вучыўся ў Кіеўскім універсітэце, пасля і працаваў у вёсцы Лясовічы Тарашчанскага раёна Кіеўскай вобласці. Вось бы каму з журналістаў пахадзіць тымі сцежкамі… Пісьменнік на ўсё жыццё захаваў цёплыя пачуцці да Украіны, яе людзей, з многімі дзеячамі культуры быў знаёмы. А вось Піліп Сцяпанавіч Орлік — гетман, аўтар першай Канстытуцыі Украіны, выдатны дзяржаўны дзеяч — меў беларускія родавыя карані: ён нарадзіўся ў вёсцы Касута, што цяпер на Вілейшчыне, у Мінскай вобласці.



Спявачкі фальклорнага гурта "Рідна пісня " ў Мінску

Пра жывыя ніціны, што звязваюць нашы народы, міжволі згадваеш, слухаючы ўкраінскія народныя песні. І прыходзіш да высновы: многія з іх па сюжэце, эмацыйным напале, прызначэнні падобныя да беларускіх. Яны вучаць мудрасці і прыгажосці, вядуць у храм любові да чалавека, да бацькі і маці, да роднай зямлі. А ці ж можа быць інакш? Мы з украінцамі — генетычна блізкія народы-суседзі, маем шмат агульных старонак гісторыі. І паводле перапісу-2009 у Беларусі жыве каля 160 тысяч украінцаў, ва Украіне — больш за 240 тысяч беларусаў. Таццяна Бей, кіраўніца культурна-асветніцкага таварыства "Обрій" аб'яднання ўкраінцаў "Ватра", працуе загадчыцай культурна-інфармацыйнага цэнтра Пасольства Украіны. Яна спрычынілася да арганізацыі канцэрта і была ў ліку ўдзячных гледачоў. Таццяна ўпэўнена: кожнае выступленне ўкраінскага гурта на беларускай сцэне — значная падзея і для ўкраінскай дыяспары, і для выканаўцаў. Дарэчы, у Таццяны Паўлаўны, нягледзячы на тое, што яна родам з Украіны, ёсць беларускія карані — па маці. Тая жыла ва Украіне, а дачку выхавала ў павазе да абодвух народаў ды іх культур.

Дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Міхаіл Рыбакоў адзначыў: выступленні ўкраінскіх гуртоў заўсёды праходзяць "з аншлагам", гледачы вельмі цёпла сустракаюць артыстаў.

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск

**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў

**Адрас рэдакцыі:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290 60 11

**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31

**E—mail:** golas_radzimy@tut.by

**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк.

**Тыраж:** 1930, **Заказ:** 1485

**Час падпісання ў друк:** 20.10

Выходзіць 1 раз на тыдзень

Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.

© "Голас Радзімы", 2014